# *ФИЛОЛОГИЧЕСКИЕ НАУКИ*

## ЛИТЕРАТУРОВЕДЕНИЕ

# *PHILOLOGY*

## LITERARY STUDIES

УДК 821.16: 821.111

**А. І. Белая[1],** доктар філалагічных навук, дацэнт,
**Н. Ч. Іваноўская[2]**
Установа адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт», вул. Войкава, 21, 225404 Баранавічы, Рэспубліка Беларусь, [1]alba.57@mail.ru , [2]nastiaivanovskaya@mail.ru

### КОНЬ ЯК ПЕРСАНАЖ МАСТАЦКАЙ АНІМАЛІСТЫКІ Ў МІЖЛІТАРАТУРНЫМ КАНТЭКСЦЕ

У артыкуле разглядаецца актуальнае пытанне даследавання анімалістычнай вобразнасці ў літаратуры як аднаго з рэзерваў і імпульсаў развіцця сучаснага гуманізму; прасочваецца дынаміка развіцця беларускай мастацкай анімалістыкі ў яе рэалістычным кірунку; асэнсоўваецца праблема літаратурных сувязей і ўплываў у стварэнні анімалістычных вобразаў. Разглядаюцца творы беларускай, рускай, яўрэйскай, англійскай літаратур, загалоўкавым персанажам якіх з’яўляецца конь: «Біяграфія Косача» У. Сыракомлі, «Буланы» К. Чорнага, «Халстамер» Л. Талстога, «Мафусаіл» Шолам-Алейхема, «Чорны прыгажун» Г. Сьюэл. Вызначаюцца асноўныя формы і прынцыпы функцыянавання дадзенага анімалістычнага вобраза, у сувязі з чым інтэрпрэтуюцца паняцці «эстэтычны антрапамарфізм», «гіпатэтычная псіхалогія каня»; аналізуецца адметнасць перадачы адчуванняў жывой істоты як варыянт псіхалагізму; робяцца высновы пра характар пераемнасці і ролю міжлітаратурных уплываў.

**Ключавыя словы:** анімалістычны вобраз; эстэтычны антрапамарфізм; гіпатэтычны псіхалагізм; тып персанажа; антрапаморфны наратар; «аўтабіяграфія каня»; міжлітаратурная камунікацыя.
Бібліягр.: 13 назваў.

**E. I. Belaya[1],** Doctor of Philology, Associate Professor,
**N. Ch. Ivanovskaya[2]**
Institution of Education “Baranavichy State University”, 21 Voykova Str., 225404 Baranavichy, the Republic of Belarus, [1]alba.57@mail.ru , [2]nastiaivanovskaya@mail.ru

### HORSE AS A CHARACTER OF ANIMALISM IN INTERLITERARY CONTEXT

The article examines the relevant issue of researching animal imagery in fiction as one of the provisions and impulses for the development of modern humanism; the development of Belarusian artistic animalism in its realistic direction is traced; the problem of literary connections and influences in the creation of animal images is discussed. The works of Belarusian, Russian, Jewish, and English literature with the horse as the main character are considered: “Biography of Kosach” by U. Syrakomlya, “Bulany” by K. Chorny, “Holstomer” by L. Tolstoy, “Methuselah” by Sholem-Aleichem, “Black Beauty” by A. Sewell.The main forms and principles of functioning of this animal image are determined through the lens of the concepts of “aesthetic anthropomorphism”, “hypothetical psychology of a horse”; the distinctiveness of the transmission of a living being sensations as a variant of psychologismis analyzed; conclusions about the nature of continuity and the quality of interliterary influencesare made.

**Key words:** animal image; aesthetic anthropomorphism; hypothetical psychologism; character type; anthropomorphic narrator; “autobiography of a horse”.
**Ref.:** 13 titles.

**Уводзіны.** Функцыянаванне ў мастацкіх творах анімалістычных вобразаў з’яўляецца адным з важных аспектаў сучаснага літаратуразнаўства. Іх даследаванне не страчвае актуальнасці як універсальны спосаб выяўлення творчай індывідуальнасці і светаадчування пісьменніка.

© Белая А. І., Іваноўская Н. Ч., 2024

Рэпазітарый БарДУ

Сімволіка анімалістычнай вобразнасці падкрэслівае натуральнасць і традыцыйнасць узаемасувязі чалавека з прыродай, узмацняе філасафічнасць і псіхалагізм твораў. Вялікі ўклад у распрацоўку пытання анімалізму ў літаратуры зрабілі айчынныя і зарубежныя вучоныя: Л. Г. Бараноўская, А. І. Бельскі, У. І. Каяла, Л. Г. Дуктава, В. І. Козіч, К. Келлі, В. Мацапура, М. Эпштэйн і інш.

Акрамя таго, «анімалізм як творча асэнсаванае і адказнае стаўленне чалавека да жывёл — адзін з найважнейшых рэзерваў і імпульсаў развіцця сучаснага гуманізму…» [1, с. 89]. У бягучым годзе ў Рэспубліцы Беларусь прыняты закон аб адказных адносінах да жывёл, які прадугледжвае абарону жывёл ад жорсткага абыходжання з імі, служыць сцвярджэнню прынцыпаў гуманнасці ў грамадстве, умацаванню маральнасці, пераемнасці беларускай традыцыі клапатлівага стаўлення да жывых істот.

У айчыннай літаратуры выяўляецца прыхільнасць да розных анімалістычных вобразаў. Важнасцю ролі каня ў рэальным жыцці абумоўлена і значнае месца гэтага анімалістычнага вобраза ў мастацкай творчасці. У беларускім фальклоры конь паказаны ў сувязі з такімі пластамі грамадства, як земляробы, ваяры і святары. У народных песнях, прымаўках і прыказках ён фігуруе як апора селяніна ў працы; у беларускіх казацкіх песнях — як верны сябар і памочнік ваяра.

У частотна-тэматычным паказальніку, складзеным А. Бельскім на матэрыяле беларускай паэзіі, зафіксавана больш за 70 твораў пра каня. Конь часта асацыюецца ў беларускіх аўтараў са светам дзяцінства: вёскай, прыродай, традыцыйным побытам. Пашыраны вобраз каня, які сімвалізуе працавітасць, адданасць лёсу. Сучаснасць амаль выштурхнула каня з рэчаіснасці, нашчадкі не заручылі з ім сваёй долі, таму ў творах адчувальныя матывы віны і суму як асабістая балючая далучанасць аўтараў «да драмы беларускай вёскі — страты гаспадара, абрыву сувязяў чалавека са спрадвечным укладам народнага жыцця» [2, с. 31].

**Матэрыялы і метады даследавання.** Матэрыял даследавання — творы У. Сыракомлі, К. Чорнага, Л. Талстога, Шолам-Алейхема, Г. Сьюэл; тэарэтычныя крыніцы, прысвечаныя аналізу вылучанай праблемы. Метады даследавання: біяграфічны, параўнальна-супастаўляльны, гісторыка-тыпалагічны.

**Вынікі даследавання і іх абмеркаванне.** Пачынаючы з XIX стагоддзя, беларуская літаратурная анімалістыка дынамічна развіваецца ў наступных кірунках: рэалістычным (творы паляўнічай тэматыкі); алегарычным (казкі, байкі); фантастычным (Я. Баршчэўскі «Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях»); псіхалагічным. З другой паловы XIX стагоддзя ў мастацкай літаратуры нарастае ўвага да працоўных жывёл, умоў іх існавання. Да гэтага часу належыць апавяданне У. Сыракомлі «Біяграфія Косача»: *«...любая праца, якая прыносіць людзям карысць, заўсёды вартая ўхвалы»* [3, с. 505]. Гэтае перакананне абумовіла, па словах аўтара, задуму напісаць жыццяпіс каня. Конь у творы У. Сыракомлі не надзелены здольнасцю размаўляць, аднак менавіта антрапамарфізуючы аўтарскі наратыў надае прадстаўніку жывёльнага свету такія чалавечыя здольнасці і пачуцці, як радасць, здзіўленне, страх. Косач *«часта імчаўся наўгалоп, кружыў вакол маткі, раздзімаў храпы, уцягваючы паветра. У грудзях яго было весела, сэрца гуляла, як рыба ў вадзе на пагоду»* [3, с. 507]. Многія моманты з жыцця каня адлюстраваны натуралістычна, але больш звяртаюць на сябе ўвагу элементы персаніфікацыі. Калі Косач першы раз убачыў дзённае святло, то *«…відаць, падумаў нешта добрае, бо аж тры разы радасна падскочыў».* Жарэбчык рос, мацнеў і *«бегаў па зямлі з незвычайнай радасцю»* [3, с. 507].

У. Сыракомля ўздымае такую важную сацыяльную праблему, як адносіны людзей да жывёл. Шляхецкая каняга, заўважае пісьменнік, *«гэта не панскі рысак, не пястун, які мае толькі адзін нейкі абавязак. У нас адзін і той жа конь служыць і для верхавой язды, і для таго, каб цягаць воз ці барану. Усё ён павінен умець, ні ад якога цяжару яму нельга ўхіляцца»* [3, с. 509].

Адносна жывых істот мэтазгодна выкарыстоўваць паняцце «гіпатэтычны псіхалагізм». Яно ўказвае на меркаваны ход думак і разваг, а таксама на ўзаемасувязь свету жывёл і свету



Рэпазіторый БарГУ

людзей. Як прыклад праламлення чалавечых адносін у гіпатэтычнай псіхалогіі каня Б. Тамашэўскі прыводзіць аповесць Л. Талстога «Халстамер» [4, с. 130]. На думку ўкраінскай даследчыцы В. Мацапуры, азначэнне «гіпатэтычная псіхалогія» з'яўляецца дарэчным, паколькі ў сучаснай тэорыі псіхалагізму, відавочна, не хапае тэрмінаў для адлюстравання псіхалогіі жывёлы ў мастацкім тэксце [5].

Адным з сучасных прыёмаў пабудовы мастацкага тэксту з'яўляецца астраненне (рус. остранение) як спосаб надаць вобразу большую выразнасць, уключыць у поле нечаканых асацыяцый. У ім злучаюцца аўтарскія стратэгіі, псіхалогія персанажа і асаблівасці іх успрымання чытачом. Гэты прыём быў абгрунтаваны В. Шклоўскім таксама ў асноўным на прыкладзе аповесці Л. Талстога «Халстамер». Аповесць займае асаблівае месца ў творчасці Л. Талстога. Яе задума ўнікальная: конь сам апавядае пра сваё жыццё. Аўтар свядома выкарыстаў такі прыём эстэтычнага антрапамарфізму, як перанясенне псіхічных уласцівасцяў чалавека на прадстаўніка свету жывёл. Звычайна гавораць аб прататыпах літаратурных асоб, людзей. Але конь Халстамер таксама рэальна існаваў. Яго гісторыю Л. Талстой пачуў ад конназаводчыка А. Стаховіча ў 1856 годзе. Трагедыя персанажа пачынаецца ўжо з моманту нараджэння. Нашчадак племянных бацькоў сам, аднак, не стаў абраным, бо *«мастью он был вороно-пегий»* [6, с. 63]. Гэта сведчыла пра выраджэнне пароды, таму жарабя стэрылізуюць. Лёс Халстамера нагадвае лёс чалавека, які не ўпісваецца ў прынятыя стандарты, і прычына яго няўдач у тым, што ён не такі, як усе. Пячатка адрынутасці застаецца на ім на ўсё жыццё.

Аповесці «Халстамер» уласцівы філасафічнасць і псіхалагізм. Пісьменнік надзяляе героя схільнасцю да глыбокага роздуму. Ад асобы Халстамера транслююцца высновы па самых розных пытаннях сучаснага Л. Талстому грамадства. Адно з іх — абарона бязмэтнага існавання ўласнасці. Людзі імкнуцца ў жыцці не да таго, каб рабіць дабро, а да таго, каб як мага больш рэчаў назваць сваімі. Халстамер разважае так: *«Меня называли собственностью человека. Слова: моя лошадь, относимые ко мне, живой лошади, казались мне так же странны, как слова: моя земля, мой воздух, моя вода»* [6, с. 77]. Гэты інстынкт амаральны і не можа быць прыняты Халстамерам, менавіта таму ён з гонарам заяўляе: *«Имя мое по родословной — Мужик первый…»* [6, с. 70]. У развагах Халстамера аб ролі ўласнасці ўгадваецца аўтарская думка. Ва ўспрыманні каня «маё» азначае «нізкі і жывёльны чалавечы інстынкт», які людзі называюць «правам уласнасці» [6, с. 77]. Халстамер — не проста ачалавечаны конь, гэта коньфілосаф, які крытычна ацэньвае жыццё людзей і чалавечага грамадства ў цэлым. У адным з ранніх чарнавікоў аповесці Л. Талстога апавядальнік нават кажа, што Халстамер не мог не адчуваць крыўды, бо «ён усё ж такі быў чалавек» (праўда, у пазнейшых варыянтах напісана «ён усё ж такі быў конь», але само апісанне пачуццяў галоўнага персанажа засталося некранутым).

Многія дэталі знешнасці старога каня маюць натуралістычны характар, але больш важна тое, якую ролю ў гэтым апісанні адыгрываюць элементы персаніфікацыі. Л. Талстой, напрыклад, піша пра «выраз твару» Халстамера, які быў па-чалавечы строга-цярплівы, глыбакадумны і пакутлівы. Было нешта велічнае і ў постаці каня, *«и в страшном соединении в ней отталкивающих признаков дряхлости, усиленной пестротой шерсти, и приёмов и выражения самоуверенности и спокойствия, сознательной красоты и силы»* [6, с. 63].

П. Васючэнка ў свой час слушна адзначыў, што «"Халстамер" Л. Талстога варта было б назваць"Таўстамерам", як і іншыя спавядальныя ягоныя творы накшталт "Споведзі" або "Дзённіка"» [7]. Сваімі аповесцямі Л. Талстой абараняў права чалавека на непадобнасць, «пярэстасць», якая заўсёды так раздражняе табун, статак, натоўп, і, вядома, пісьменнік сцвярджаў адзінства чалавека і прыроды.

Акрамя праблем уласнасці, адносін чалавека да жывых істот, Л. Талстой узнімае праблему стаўлення да старасці. Аўтар падкрэслівае, што ў статку дамінуюць маладыя і моцныя, паказвае, што Халстамер пакутаваў ад гэтай шчаслівай моладзі больш, чым ад людзей. *«Ни тем, ни другим он не делал зла. Людям он был нужен, но за что же мучали его молодые лошади?»* [6, с. 67]. Аднак жорсткасць і несправядлівасць не здолелі зламаць Халстамера. Ён заклікаў на дапамогу ўсё сваё цярпенне і нават пачаў *«находить какое-то лошадиное удовольствие в этом»* [6, с. 61].

Рэпазіторый БарДУ

Як і Л. Талстой, брытанская пісьменніца Ганна Сьюэл паклала ў аснову свайго адзінага рамана «Чорны прыгажун» (1877) гісторыю каня, які сам апавядае пра сваё жыццё. Аднак калі ў Л. Талстога Халстамер — антрапаморфны персанаж, за якім, паводле меркавання даследчыкаў, бачыцца сам аўтар, то Чорны прыгажун у Г. Сьюэл — персанаж антрапамарфізаваны, пад якім аўтар не мае на ўвазе чалавека. Аб'ядноўвае гэтыя творы наяўнасць антрапамарфізуючага наратыву.

У 14-гадовым узросце будучая пісьменніца атрымала сур'ёзную траўму нагі і, застаўшыся кульгавай, перамяшчалася пераважна ў павозцы, запрэжанай любімым поні. Да працы над раманам Г. Сьюэл прыступіла ў 51-гадовым узросце. З 1876 года, ужо не здольная пісаць самастойна, яна надыктоўвала тэкст сваёй маці. Першапачаткова Г. Сьюэл не мела задумы напісаць мастацкі твор, а імкнулася культываваць дабрыню, спачуванне і клопат да коней. Раман набыў сусветную вядомасць, але Г. Сьюэл не дажыла да поспеху сваёй кнігі. Яе апошнім жаданнем было, каб коні ў пахавальнай працэсіі былі вызвалены ад збруі.

Ствараючы «аўтабіяграфію» каня, Г. Сьюэл закранула тэмы, непадуладныя часу: мужнасць, настойлівасць, дабрыню, любоў і павагу, — а таксама надзвычай праўдападобна ўзнавіла ўмовы існавання і псіхалогію жывёлы. Высакародны конь па імені Чорны прыгажун верай і праўдай служыў людзям. Яго доўгае жыццё было поўнае нечаканых паваротаў і драматычных падзей. Прайшоўшы шлях ад дурненькага жарабяці да мудрай старой жывёліны, Прыгажун навучыўся адрозніваць дабро і зло, быць адданым і цярплівым, цаніць увагу і спачуванне. Пісьменніца асабліва падкрэслівае дзіўную здольнасць коней тонка адчуваць свет: *«Господь наделил людей разумом, и они могут осмысливать всё, что с ними случается. Животным Бог дал вместо разума чувства, которые в минуты опасности оказываются куда совершеннее разума. Потому-то животным и удаётся так часто спасать хозяев»* [8, с. 64].

І Г. Сьюэл, і Л. Талстой узнаўляюць драбнюткія дэталі жыцця анімалістычных персанажаў, прасочваюць этапы страты імі былога становішча да поўнага знясілення жыццёвых сіл, знявагі на гэтым шляху. У абодвух творах гаворыцца не проста пра старых коней, а пра істот спадчыннай высакароднасці, якая кантрастуе з іх цяперашнім становішчам. На службе чалавеку коні падарвалі сваё здароўе. Чорны прыгажун скардзіцца: *«...я так и трясся от холода; ноги болели, спина болела, болела и грудь, все тело мое ныло от боли»* [8, с. 90]. Не лепш пачуваецца і Халстамер: *«Я болел, меня мучали и калечили — лечили, как это называют люди»* [6, с. 71].

І ўсё ж, як слушна заўважыў у свой час В. Шклоўскі, калі свіфтаўскі тэкст пра дзяржаву коней замешаны на пагардзе да людзей, то «Халстамер» «напісаны на спробе пагарды», якая, аднак, «не ўдалася. Коні Талстога шкадуюць людзей» [9]. У творы Г. Сьюэл — нават спрабуюць абараніць: *«Мне кажется, если мы станем говорить плохо о людях, это будет несправедливо по отношению к лучшим из них»* [8, с. 54].

Падабенства гэтых двух дзіўных вобразаў, стварэнне якіх раздзяляюць усяго некалькі гадоў, з'явілася, на думку К. Келлі, хутчэй за ўсё, вынікам выпадковага супадзення. Дапушчальна, што Л. Талстой мог прачытаць «Чорнага прыгажуна» яшчэ да таго, як у яго аформілася канчатковая версія «Халстамера». Але ў творах канца 1870-х і ў 1880-я гады няма ніводнага намёку на тое, што ён чытаў кнігу Г. Сьюэл ці чуў аб ёй. А з дзённікаў і лістоў пісьменніка вынікае: яшчэ з 1863 года Л. Талстой працаваў над «гісторыяй аднаго мерына» і ў ім ужо была сцэна з п'яным конюхам і шэраг сцэн скачак. У 1884 годзе ён зноў звярнуўся да гэтай тэмы: С. Талстая сцвярджала, што выпадкова знайшла ў паперах мужа чарнавік гісторыі пра каня і параканала яго закончыць твор [10].

Як адзначаў А. Адамовіч, за апавяданнем К. Чорнага «Буланы» стаіць аповесць «Халстамер» Л. Талстога, напісаная ў 1886 годзе. Аднак у 1902-м убачыла свет апавяданне яўрэйскага класіка Шолам-Алейхема з загалоўкавым анімалістычным вобразам — «Мафусаіл». Гэта імя біблейскага персанажа, якое асацыюецца з даўгалеццем. Мафусаіл у апавяданні — вельмі стары конь. Па апісанні здаецца, што гэта партрэт старога чалавека: абцяжараны гадамі, ён *«не меў ніводнага зуба ў роце, калі не лічыць двух-трох пяцькоў, якімі ён з цяжкасцю жаваў, калі было што жаваць...»*. Сказана таксама, што Мафусаіл быў рахманы працаўнік, руплівец. І толькі



Рэпазіторый БарДУ

з працягу відаць, што гэта стары конь, *«высокі, худы, аблезлы, з папабіванай спінай і мутнымі вачыма...»* [11, с. 430].

Герой Шолам-Алейхема — вобраз персаніфікаваны. Конь надзелены ўласцівасцямі чалавечай псіхікі: ён, у прыватнасці, можа плакаць, мае своеасаблівае пачуццё гумару, здольны думаць і разважаць. Па словах пісьменніка, Мафусаіл быў увогуле схільны да *«невясёлага конскага роздуму»* [11, с. 431]. Праз адносіны да каня пісьменнік выяўляе маральную сутнасць людзей, з якімі сутыкае Мафусаіла яго няўдалы конскі лёс. Чаго толькі не вытвараў з ім цыган, каб конь шпарчэй бегаў! Надзвычай жорсткімі былі і дзеці, якія *«рабілі яму процьму непрыемнасцей, здзекваліся, ганьбілі яго»* [11, с. 435]. Бадай кожны наступны ўладальнік Мафусаіла нібыта знарок імкнецца наблізіць смерць каня, зусім не лічачы яго за жывую, здольную адчуваць істоту. Нарэшце Мафусаіла забраў да сябе Касрыел-вадавоз, які усё жыццё марыў, каб Бог узнагародзіў яго канём. Пры гэтым аўтар адзначае, што Мафусаіл быў на старасці год у Касрыела «замест каня»: каб шчаслівыя гаспадары не саромеліся суседзяў, то меліся б паставіць яго ў хаце! Бедная сям'я вадавоза шчодра дзялілася з дарагой ім істотай усім, што магла адарваць ад сябе. Мафусаіл мог бы сказаць, што мае шчаслівую старасць, каб не дзеці. Дзеці любілі яго, піша аўтар, але лепш бы яны яго болей шкадавалі. Дурныя дзіцячыя жарты і скарацілі жыццё рахманаму коніку… У апавяданні «Мафусаіл» адбілася жыццёвая мудрасць яўрэйскага класіка. Адносіны да састарэлага каня з'яўляюцца свайго роду пробным каменем маральнасці грамадства.

К. Чорны выяўляў надзвычайную цікавасць да вопыту іншых літаратур. Выпрацаваць, і па магчымасці паскорана, сваю сталую празаічную традыцыю можна, лічыў пісьменнік, калі ўключыць беларускую прозу ў «сілавое поле» рускай і сусветнай літаратурнай традыцыі. «Глядзець на сваё скрозь павелічальнае шкло сусветнай культуры чалавеказнаўства — вось што патрэбна літаратару» [12]. Сцвярджаючы, што за апавяданнем К. Чорнага «Буланы» стаіць «Халстамер» Л. Талстога, А. Адамовіч не выключае, што ў такім прамым наследаванні можна бачыць пачцівую залежнасць ад класікаў, у той час як было шмат тых, хто класіку ігнараваў. І ўсё ж, упэўнены даследчык, К. Чорны імкнуўся не паўтараць вялікіх, а з іх дапамогай рабіў сваё.

Паводле А. Адамовіча, стварэнне такога анімалістычнага вобраза, як Буланы, — эксперымент па ўзбагачэнні псіхалагізму беларускай прозы. Сэнсавы цэнтр апавядання — філасофскі роздум над жыццём. Таксама, як і яго папярэднікі, К. Чорны ўзнімае праблему адносін да старасці. Праз вобраз Буланага пісьменнік паказвае адчуванні жывой істоты на мяжы жыцця і смерці. Асноўная думка твора заключаецца ў сцвярджэнні ідэі кругазвароту жыцця: калі істота памірае, яна дае сілы новаму жыццю. Гаспадар каня Раман Драгун прыходзіць да высновы, што смерці Буланага ніяк не пазбегнуць, што конь павінен паслужыць «матэрыялам для жыцця». Аўтар праводзіць паралелі паміж адчуваннямі каня і гаспадара, перадае прыхаваныя пачуцці і настроі, паміж якімі існуе непарыўная сувязь: *«Жаваў ён [конь] сена ў цёмным хляве спакойна, без тых бур, якімі кіпеў чалавек, а чалавек стаяў каля яго і ашукваў сябе: "Дык гэта ж усё так, як трэба, — Буланы жуе сена, стоячы на чорнай ад змроку саломе; тут жа прытульна і цёпла. І я стаю і гляджу ў ціхую адзіноту зімовага вечара"»* [13, с. 318—319]. Псіхалагізацыя вобразаў жывёл, як паказвае апавяданне «Буланы», адыгрывае значную ролю ў пастаноўцы вострых сацыяльна-маральных праблем жыцця. Адносіны да каня даюць уяўленне пра псіхалагічныя рысы і каштоўнасныя арыенціры людзей.

**Заключэнне.** Міжлітаратурныя камунікацыі выступаюць як моцны стымул развіцця мастацтва слова, бо яно не можа існаваць ізалявана. Уплывы з'яўляюцца тымі абставінамі, без якіх ні адна літаратура не мела б сучаснага аблічча. Калі гаварыць пра Г. Сьюэл і Л. Талстога, то было б вельмі спакусліва выявіць не толькі падабенства іх наватарскіх твораў, але і ўплыў папярэдняга на наступны. І ўсё ж варта пагадзіцца з думкай, якая выказваецца сучаснымі зарубежнымі літаратуразнаўцамі, што блізкасць гэтых двух тэкстаў хутчэй мае выпадковы характар і абумоўлена адносінамі да жывёл у тагачасным грамадстве. Значную ролю адыгралі і асабістыя ўражанні аўтараў як сведак згубных вынікаў цяжкай працы, нядбайнага абыходжання з коньмі.

Рэпазіторый БарДУ

Праблема адносін чалавека да жывёлы, як і праблема адносін да старасці, у іншы час была актуальнай для Шолам-Алейхема і К. Чорнага. Думка аб тым, што не варта абсалютызаваць ці перабольшваць ролю міжлітаратурных кантактаў і ўплываў, а мэтазгодна разглядаць іх толькі як сістэму фактараў уздзеяння, сцвярджаецца і айчыннымі навукоўцамі. Асабліва выразна гэта відаць у супастаўленні твораў К. Чорнага і Л. Талстога. К. Чорны ўлічваў творчы вопыт рускага класіка ў новай культурнай сітуацыі, пераносячы акцэнт са знешніх падзей ва ўнутраны свет персанажа, звяртаючыся да сферы падсвядомага, засвойваючы новыя прыёмы псіхалагічнага пісьма.

**Спіс цытаваных крыніц**

1. *Эпштейн, М. Н.* Природа, мир, тайник вселенной... Система пейзажных образов в русской поэзии / М. Н. Эпштейн. — М. : Высш. шк., 1990. — 303 с.
2. *Бельскі, А. І.* Мастацкая анімалістыка ў сучаснай беларускай літаратуры (да праблем вывучэння і тыпалогіі) / А. І. Бельскі // Весн. Беларус. дзярж. ун-та. Сер. 4 : Філалогія. Журналістыка. Педагогіка. — 2000. — № 2. — 32 с.
3. *Сыракомля, У.* Выбраныя творы / У. Сыракомля ; уклад., прадм., камент. К. Цвіркі. — Мінск : Кнігазбор, 2006. — 528 с.
4. *Тамашэўскі, Б. У.* Тэорыя літаратуры. Паэтыка : навуч. дапам. / Б. В. Тамашэўскі ; уступ. арт. Н. Дз. Тамарчанка ; камент. С. М. Бройтмана пры ўдзеле Н. Дз. Тамарчанкі. — М. : Аспект-Прэс, 1999. — 334 с.
5. *Мацапура, В. И.* Приём остранения в произведениях Н. В. Гоголя: специфика использования и способы выражения [Электронный ресурс] / В. И. Мацапура. — Режим доступа: https://www.domgogolya.ru/science .— Дата доступа: 04.03.2024.
6. *Толстой, Л. Н.* Повести / Л. Н. Толстой. — М. : Совет. Россия, 1983. — 224 с.
7. *Васючэнка, П.* Пятрогліфы і філалагемы [Электронны рэсурс] / П. Васючэнка. — Рэжым доступу: https://dziejaslou.by/old/www.dziejaslou.by/ . — Дата доступу: 20.10.2023.
8. *Сьюэлл, А.* Чёрный красавчик / А. Сьюэлл ; пер. с англ. А. Иванова и А. Устиновой ; худож. С. Гераскевич. — М. : ЭНАС-КНИГА, 2018. — 240 с.
9. *Шкловский, В.* О теории прозы [Электронный ресурс] / В. Шкловский. — Режим доступа: https://monoskop.org/ . — Дата доступа: 08.04.2024.
10. *Келли, К.* «Человеконогий зверь» против «звероногого человека»: животные как рабы, слуги и спутники человека в европейской культуре эпохи Постпросвещения [Электронный ресурс] / К. Келли. — Режим доступа: https://www.nlobooks.ru/magazines/novoe_literaturnoe_obozrenie/ . — Дата доступа: 14.03.2024.
11. *Шолам-Алейхем.* Тэўе-малочнік: аповесці, апавяданні, юнац. раман / Шолам-Алейхем ; пер. з ідыш ; рэдкал.: С. А. Андраюк [і інш.] ; прадм. Ю. Канэ ; маст. Л. Трэстман. — Мінск : Маст. літ., 1992. — 510 с.
12. *Адамовіч, А.* Класік беларускай прозы [Электронны рэсурс] / А. Адамовіч. — Рэжым доступу: https://knihi.com/Ales_Adamovic/Klasik_bielaruskaj_prozy_zbor8.html . — Дата доступу: 10.04.2024.
13. *Чорны, К.* Збор твораў : у 8 т. / К. Чорны. — Мінск : Маст. літ., 1972. — Т. 1 : Апавяданні. 1923—1927. — 554 с.

Паступіў у рэдакцыю 08.07.2024.

Репозиторий БарГУ